# "БУМ-БАМ-ЛІТ" УЗБРОІЎСЯ "ТАЗІКАМ", АЛЬБО АПОВЕД ПРА ТОЕ, ЯК АПАНТАНА ГРУКАЮЦЬ БУМБАМЛІТАЎЦЫ Ў БЛЯШАНАЕ ДНО ТУТЭЙШЫХ ТАМТАМАЎ*

**Н.В. Дзенісюк**

Літаратурная суполка " Бум-Бам-Літ " зарадзілася ўвесну 1995 года і з таго часу ўздымае такі гармідар, бесперапынна грукаючы ў металічнае дно аб'екта сваёй канструктыўнай творчасці, што нялёгка часам кволенькаму голасу самотнага пісьменніка прабіцца скрозь шум, які запаўняе літаратурную арэну спаборніцтва творцаў і сягае далёка за яе межы. Занадта моцны голас трэба мець, каб заглушыць "бумканне" і "бамканне" новай, постмадэрнісцкай літаратуры. У пэўным сэнсе "Бум-Бам-Літ" з'яўляецца спадкаемцам "Тутэйшых" і Таварыства вольных літаратараў. Іх аб'ядноўвае агульная ідэя – ідэя стварэння новай літаратуры, новых формаў яе выражэння і ўспрыняцця. Літаратура не ёсць застылая традыцыя, гэта няспынны рух наперад, але рух на ўсіх узроўнях - зместу, формы, гукавой арганізацыі словаў, сінтаксічнага афармлення сказаў, пунктуацыі і г.д. Аднак ёсць тое, што адрознівае "Бум-Бам-Літ" ад яго папярэднікаў. "Тутэйшыя", як пазней і Таварыства вольных літаратараў, змагаліся з сацрэалізмам, так званымі афіцыйнымі пісьменнікамі, антыбеларушчынай і дэкларатыўнай беларушчынай. Яны падзялялі сучаснае літаратурнае войска на ар'ергард і авангард, на графаманаў і сапраўдных пісьменнікаў. Але так ці інакш "Тутэйшыя" і Таварыства вольных літаратараў зрабілі свой "бум" у сучаснай літаратуры і неўзабаве зніклі з авансцэны літаратурнага працэсу. "Бум-Бам-Літ" у адрозненне і ад адных, і ад другіх ні з кім не змагаецца, ні з кім не варагуе і не перацягвае коўдру з іншых на сябе, каб агаліць чужыя заганы, але схаваць свае.

* Тамтамамі В. Акудовіч называе афрыканскія тазікі. Менавіта Афрыка – радзіма карыснай для чалавека і шматпрыдатнай пасудзіны.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Бумбамлітаўцы ёсць такія, якія яны ёсць. Яны "натуральныя для новага жыцця", бо яны выяўляюць сябе праз літаратуру і літаратуру праз сябе. Бумбамлітаўцы, шукаючы прыкладанне свайму таленту, ствараюць "сваё" пісьмо, уласную легенду быцця.

"Бум-Бам-Літ" не мае нейкай дакладна акрэсленай эстэтычнай праграмы, а тым больш выразна сфармуляванай, хай сабе і постмадэрнісцкай, тэорыі. Бумбамлітаўцы імкнуцца выйсці па-за межы традыцыйнага разумення літаратуры. Для іх літаратура не ёсць сукупнасць мастацкіх твораў, якія хаваюць пад вокладкай абвугленыя словы на белым полі маўклівай паперы. Ці ж можна толькі з дапамогай словаў дакладна перадаюць свае думкі, пачуцці, адчуванні? Тым больш, калі словы гэтыя, адціснутыя на друкарскім станку, згубілі сваё пачуццё. Літаратура, на думку бумбаўлітаўцаў, гэта пошук новых шляхоў да свядомасці жывых істотаў (не толькі чалавека, але і жывёлы, а, магчыма, і насельнікаў іншых планетаў). І шляхі гэтыя ляжаць праз словы, праз інтанацыю, асобныя гукі, міміку, жэсты, праз дзіўную вопратку, нечаканы падбор дэкарацый ды іншыя тэатральныя сродкі. Таму бумбаўлітаўцы "ідуць у народ". Наладжваюць свае творчыя вечарыны на адкрытых пляцоўках і ператвараюць іх у відовішча. Яны цудоўна ўсведамляюць, што беларускай мовай, а тым больш беларускай літаратурай мала каго зацікавіш з нашых суайчыннікаў. Таму асноўнай стратэгіяй руху ББЛ сёння з'яўляецца тэатралізацыя літаратуры.

На ўсіх імпрэзах ББЛ абавязкова прысутнічае тазік, які стаўся своеасаблівым сімвалам літаб'яднання. Бумбамлітаўцы ні на хвіліну не выпускаюць металічную пасудзіну са сваіх рук, а паколькі тэхнічны прагрэс дазволіў удасканаліць дадзены аб'ект вытворчых адносінаў ( цяпер тазік складваецца), дык бумбаўлітаўцы ўвесь час носяць яго ў кішэні і пры патрэбе грукаюць у дно нашчадка афрыканскіх тамтамаў і не даюць спакойна спаць літаратурным правадырам племені "тутэйшых". І так жа любяць бумбамлітаўцы свой тазік, што нават зборнік твораў сяброў ББЛ назвалі ў яго гонар - "Тазік беларускі". Як бачым, не могуць праігнараваць бумбаўлітаўцы друкаванае слова, хоць і лічаць яго недастатковым для самарэалізацыі і выражэння аўтарскай вібрацыі думкі ці эмоцыяў.

У зборніку сабраныя творы "слупоў" "Бум-Бам-Літа" (так яны называюць сталых творцаў руху ББЛ): Юрася Барысевіча, Альгерда Бахарэвіча, Зміцера Вішнёва, Севы Гарачкі, Віктара Жыбуля, Сержука Мінскевіча, Алеся Туровіча, Іллі Сіна.

Тэарытычную базу для стварэння і функцыянавання аб'яднання ўзводзіў філосаф В. Акудовіч. Менавіта яго артыкулам адкрываецца "Тазік беларускі".

Падагульняючы,скажам, што тазік недарэмна быў абраны ў якасці галоўнай зброі і інструмента ББЛ. У час усталявання тэхнагеннай цывілізацыі, няспыннага развіцця індустрыялізацыі, разгортвання тэхнічнага прагрэсу, супраць чаго, відавочна, выступаюць бумбаўлітаўцы, у час татальнага панавання электронікі, музычнай і відэакультур гучанне тазіка,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ягонае рэзкае, пранізлівае, надакучлівае бумканне і бамканне падаецца натуральным і таму прыемным, вяртае ў гарманічны свет продкаў-дзікуноў, якія рытмічнымі ўдарамі ў скураныя бубны нагадвалі сусвету аб сваім існаванні, падчас пэўных рытуальных дзеянняў атаясамлівалі сябе з прыродай, а прыроду з сабой.